
ISSN 0868—8621



ВЕДАМАСЦІ

ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 8

1993 год

ВЫДАННЕ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МІНСК



ВЕДАМАСЦІ

ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 сакавіка 1993 г. **№ 8(82)** **Выдаюцца з 1990 г.**

ЗМЕСТ

Законы і пастановы, прынятыя на дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

няў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь».

51. Закон Рэспублікі Беларусь аб унясенні дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.
52. Закон Рэспублікі Беларусь аб унясенні змянення ў артыкул 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь».
53. Закон Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь».
54. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб змяненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.
55. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.
56. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб выбранні Шаладонава В. І. Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.
57. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб праекце Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
58. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.
59. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і знешнеэканамічных сувязях.
60. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб намесніку старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па праблемах чарнобыльскай катастрофы.
61. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб сакратару Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву.
62. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб зменах у складзе Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю.
63. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб змяненні ў складзе Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па заканадаўству.
64. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб прызнанні паўнамоцтваў народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь, выбранага 17 студзеня 1993 года.
65. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб Эканамічнай праграме Урада Рэспублікі Беларусь на 1993 год і асноўных напрамках развіцця народнай гаспадаркі на перспектыву.

* * *

66. Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб прадастаўленні зямельных участкаў Беларускаму навукова-даследчаму інстытуту кардыялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь для будаўніцтва рэспубліканскага кардыялагічнага цэнтра.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

48 Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях*

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт. 505; 1985 г., № 32, арт. 449, № 35, арт. 505; 1986 г., № 17, арт. 227; 1987 г., № 26, арт. 337; 1989 г., № 11, арт. 99; Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 13(15), арт. 154, № 23, арт. 309; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 15, арт. 253, 255), наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Абзац другі артыкула 81 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу на службовых асоб у размеры да 0,5 мінімальнай заработнай платы».

2. Абзац другі артыкула 82 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу на грамадзян у размеры да 0,2 мінімальнай заработнай платы».

3. У артыкуле 110^2:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры да 0,5 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры да 0,1 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі трэцяй выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры да 0,1 мінімальнай заработнай платы».

4. У артыкуле 112:

частку першую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Кіраванне вадзіцелямі транспартнымі сродкамі, якія маюць няспраўнасці тармазной сістэмы або рулявога кіравання ці знос шын ніжэй дапушчальнай мяжы, або пераабсталяванымі без адпаведнага дазволу, або неабсталяванымі ў адпаведнасці з дзеючымі нормамі,—

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,5 мінімальнай заработнай платы»;

* *Апублікаваны ў газетах: «Звязда» — 10 лютага 1993 года, «Народная газета» — 16 лютага 1993 года.*

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,2 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі трэцяй выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры 0,05 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі чацвёртай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,2 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі пятай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да 1,5 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі шостай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 1,5 да 2,5 мінімальнай заработнай платы».

5. У артыкуле 113:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,25 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры 0,5 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі трэцяй выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да адной мінімальнай заработнай платы».

6. Артыкул 113[1] выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 113[1]. **Непадпарадкаванне вадзіцеляў транспартных сродкаў сігналам рэгулявання дарожнага руху, невыкананне патрабаванняў дарожных знакаў, разметкі, парушэнне правіл перавозкі людзей і іншых правіл дарожнага руху**

Непадпарадкаванне вадзіцеляў транспартных сродкаў сігналам рэгулявання дарожнага руху, невыкананне патрабаванняў аб прадастаўленні перавагі ў руху, дарожных знакаў або разметкі праезнай часткі дарог, парушэнне правіл праезду перакрыжаванняў, прыпынкаў грамадскага транспарту або пешаходных пераходаў, перавозкі людзей, абгону, манеўравання, прыпынку або стаянкі транспартных сродкаў, карыстання асвятляльнымі прыборамі ў цёмны час сутак або ва ўмовах недастатковай бачнасці —

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,25 мінімальнай заработнай платы.

Удзел вадзіцеляў транспартных сродкаў у групавым перамяшчэнні, якое стварае пагрозу бяспецы руху, а таксама парушае грамадскі парадак і спакой грамадзян,—

цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,15 да 0,25 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам тэрмінам на шэсць месяцаў.

Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай і другой гэтага артыкула, якія выклікалі стварэнне аварыйнай абстаноўкі,—

цягнуць накладанне штрафу ў размеры ад 0,25 да 0,5 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам тэрмінам ад шасці месяцаў да аднаго года.

Заўвага. Пад стварэннем аварыйнай абстаноўкі разумеюцца дзеянні, якія прымусілі іншых удзельнікаў руху рэзка змяняць хуткасць, напрамак руху або прымаць іншыя меры да забеспячэння ўласнай бяспекі або бяспекі іншых грамадзян».

7. У артыкуле 114:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,25 да 0,5 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам на тэрмін ад шасці месяцаў да аднаго года»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры 0,5 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам тэрмінам на адзін год».

8. У артыкуле 115:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 2,5 да 5 мінімальных заработных плат або пазбаўленне права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў на тэрмін ад двух да трох гадоў»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры 5 мінімальных заработных плат»;

абзац другі часткі трэцяй выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 5 да 10 мінімальных заработных плат або пазбаўленне права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў на тэрмін ад трох да пяці гадоў».

9. Артыкулы 116 і 117 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 116. **Парушэнне вадзіцелямі транспартных сродкаў правіл дарожнага руху, якое выклікала прычыненне пацярпеўшаму лёгкага цялеснага пашкоджання, пашкоджанне транспартных сродкаў або іншай маёмасці, а таксама іншыя парушэнні правіл дарожнага руху**

Парушэнне вадзіцелямі транспартных сродкаў правіл дарожнага руху, прадугледжаных артыкуламі 112—114 гэтага Кодэкса, якое выклікала прычыненне пацярпеўшаму лёгкага цялеснага пашкоджання ці пашкоджанне транспартных сродкаў, грузаў, дарог, дарожных і іншых збудаванняў або іншай маёмасці, а таксама пакіданне ў парушэнне ўстаноўленых правіл месца дарожна-транспартнага здарэння, удзельнікамі якога яны з'яўляюцца,—

цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да 2,5 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам на тэрмін ад аднаго да двух гадоў.

Учыненне вадзіцелямі іншых парушэнняў правіл дарожнага руху, акрамя прадугледжаных артыкуламі 112—115 гэтага Кодэкса, якія выклікалі вынікі, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула,—

цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да 1,5 мінімальнай заработнай платы.

Учыненне вадзіцелямі іншых парушэнняў правіл дарожнага руху, акрамя прадугледжаных артыкуламі 112—115, 117—119 і часткамі першай і другой гэтага артыкула,—

цягне папярэджанне.

Артыкул 117. **Кіраванне транспартнымі сродкамі асобамі, якія не маюць пры сабе дакументаў на кіраванне імі**

Кіраванне транспартнымі сродкамі асобамі, якія не маюць пры сабе вадзіцельскага пасведчання або талона да яго, даверанасці, рэгістрацыйных або іншых дакументаў, прадугледжаных правіламі дарожнага руху, а таксама перадача кіравання транспартным сродкам асобе, якая не мае пры сабе вадзіцельскага пасведчання або талона да яго,—

цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,2 мінімальнай заработнай платы».

10. У артыкуле 118:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да адной мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад адной да 1,5 мінімальнай заработнай платы».

11. У артыкуле 119:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,2 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 1,5 да 5 мінімальных заработных плат або пазбаўленне права кіравання ўсімі відамі транспартных сродкаў тэрмінам на тры гады».

12. У артыкуле 120:

абзац другі часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры 0,05 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў размеры ад 0,1 да 0,25 мінімальнай заработнай платы»;

абзац другі часткі трэцяй выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу ў размеры ад 0,5 да 1,5 мінімальнай заработнай платы».

13. Абзац другі артыкула 121 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу на кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый або іншых службовых асоб, адказных за тэхнічны стан і эксплуатацыю транспартных сродкаў, у размеры ад 0,5 да адной мінімальнай заработнай платы».

14. Абзац другі артыкула 122 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу на кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый або іншых службовых асоб, адказных за тэхнічны стан і эксплуатацыю транспартных сродкаў, у размеры 1,5 мінімальнай заработнай платы».

15. Абзац другі артыкула 123 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу на грамадзян у размеры да 0,5 мінімальнай заработнай платы і на службовых асоб да адной мінімальнай заработнай платы, а на вадзіцеляў транспартных сродкаў — накладанне штрафу ў размеры да 0,5 мінімальнай заработнай платы або пазбаўленне права кіравання транспартным сродкам на тэрмін да аднаго года».

16. Абзац другі артыкула 123^1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«цягне накладанне штрафу на кіраўнікоў або іншых службовых асоб прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый у размеры адной мінімальнай заработнай платы».

17. У артыкуле 203:

з часткі першай выключыць словы «часткай трэцяй артыкула 115»;

у пункце 2 часткі другой словы «часткамі першай і другой артыкула 116, артыкуламі 117, 119—123^1» замяніць словамі «артыкуламі 116—123^1»;

у абзацы першым пункта 3 часткі другой словы «часткай першай артыкула 113, часткай другой артыкула 114, артыкулам 117,

часткай першай артыкула 118» замяніць словамі «часткамі першай і другой артыкула 113, часткай першай артыкула 113[1], часткай трэцяй артыкула 116, артыкулам 117, часткай першай артыкула 118, часткай першай артыкула 119»;

абзац другі пункта 3 часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«за адміністрацыйныя правапарушэнні, прадугледжаныя артыкулам 82, часткай другой артыкула 110[2], часткамі першай — чацвёртай артыкула 112, часткамі першай і другой артыкула 113, часткай першай артыкула 113[1], часткай трэцяй артыкула 116, артыкулам 117, часткай першай артыкула 118, часткай першай артыкула 119, часткамі першай і другой артыкула 120, артыкуламі 121, 129—131 гэтага Кодэкса,— старшыя дзяржаўныя аўтамабільныя інспектары, дзяржаўныя аўтамабільныя інспектары, старшыя інспектары, інспектары дарожна-патрульнай службы і іншыя інспектары, якія ажыццяўляюць кантроль за выкананнем правіл дарожнага руху і іншых нарматыўных актаў, што рэгламентуюць бяспеку дарожнага руху».

18. У частцы першай артыкула 237 словы «часткамі другой і трэцяй артыкула 112» замяніць словамі «часткамі першай — чацвёртай артыкула 112, часткай першай артыкула 113, часткай першай артыкула 113[1], часткай трэцяй артыкула 116, артыкулам 117, часткай першай артыкула 119».

19. Частку чацвёртую артыкула 244 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пры парушэнні правіл дарожнага руху, за якое ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам можа быць накладзена адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу або пазбаўлення права кіравання аўтатранспартам, у вадзіцеля адбіраецца вадзіцельскае пасведчанне на тэрмін да выканання спагнання, аб чым робіцца запіс у пратаколе».

20. Пункт 4 часткі першай артыкула 273 пасля слоў «змяняе меру» дапоўніць словамі «і від».

21. Увесці ў дзеянне гэты Закон з дня яго апублікавання.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

26 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2126—XII.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

49 Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь»*

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 1990 года «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 3(5), арт. 13; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 19, арт. 302) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Назву главы 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Глава 2. Дзяржаўныя прадпрыемствы».

2. У артыкуле 5:

назву і частку першую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 5. **Дзяржаўнае прадпрыемства, якое адносіцца да рэспубліканскай уласнасці**

Дзяржаўнае прадпрыемства, якое адносіцца да рэспубліканскай уласнасці (далей у артыкуле — дзяржаўнае прадпрыемства), ствараецца органамі Рэспублікі Беларусь, упаўнаважанымі кіраваць дзяржаўнай маёмасцю»;

частку другую пасля слоў «устаноўленых уласнікам» дапоўніць словамі «або ўпаўнаважаным ім органам».

3. У артыкуле 6:

назву і частку першую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 6. **Дзяржаўнае прадпрыемства, якое адносіцца да камунальнай уласнасці**

Дзяржаўнае прадпрыемства, якое адносіцца да камунальнай уласнасці (далей у артыкуле — камунальнае прадпрыемства), ствараецца мясцовым Саветам народных дэпутатаў або ўпаўнаважанымі ім мясцовымі органамі кіравання»;

частку другую пасля слова «дэпутатаў» і пасля слова «уласнікам» дапоўніць словамі «або ўпаўнаважаным ім органам».

4. У артыкуле 7:

дапоўніць артыкул пасля часткі першай новай часткай наступнага зместу:

«Аб'яднанне прадпрыемстваў можа таксама ствараццца па рашэнню ўласніка прадпрыемстваў або ўпаўнаважанага ім орга-

---

* *Апублікаваны ў газетах «Звязда» і «Народная газета» 16 лютага 1993 года.*

на. Пры гэтым такому аб'яднанню могуць быць дэлегаваны правы па кіраванню прадпрыемствамі, што ўваходзяць у яго састаў»;

частку другую гэтага артыкула лічыць часткай трэцяй.

5. Артыкулы 11 і 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 11. **Выхад прадпрыемства з аб'яднання**

Прадпрыемства, якое ўваходзіць у аб'яднанне, створанае на добраахвотных пачатках, мае права выйсці з яго саставу на ўмовах, прадугледжаных статутам аб'яднання.

Прадпрыемства, якое ўваходзіць у аб'яднанне, створанае ў адпаведнасці з часткай другой артыкула 7 гэтага Закона, выходзіць з такога аб'яднання па рашэнню ўласніка або ўпаўнаважанага ім органа.

Артыкул 12. **Ліквідацыя аб'яднання**

Аб'яднанне ліквідуецца ў парадку, прадугледжаным раздзелам VII гэтага Закона».

6. З артыкула 15 выключыць словы «іншых саюзных рэспублік».

7. Частку другую артыкула 20 пасля слоў «іх кампетэнцыя» дапоўніць словамі «размер статутнага фонду».

8. Частку чацвёртую артыкула 25 дапоўніць сказам наступнага зместу:

«Даходамі незарэгістраванага прадпрыемства з'яўляецца сума выручкі за вылікам з яе матэрыяльных і прыроўненых да іх затрат».

9. Артыкул 28 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 28. **Перарэгістрацыя прадпрыемства. Рэгістрацыя змяненняў і дапаўненняў ва ўстаноўчыя дакументы прадпрыемства**

Прадпрыемства падлягае перарэгістрацыі ў выпадку яго рэарганізацыі або змены ўласніка.

Пры перарэгістрацыі прадпрыемства прымяняюцца тыя ж правілы, што і пры рэгістрацыі.

Змяненні і дапаўненні ва ўстаноўчыя дакументы прадпрыемства падлягаюць рэгістрацыі ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь».

10. Артыкул 37 дапоўніць часткай шостай наступнага зместу:

«У выпадках невыкарыстання або неэфектыўнага выкарыстання маёмасці прадпрыемствам, якое адносіцца да дзяржаўнай уласнасці, такая маёмасць можа быць адабрана ўласнікам прадпрыемства або ўпаўнаважаным ім органам».

11. Абзац пяты часткі першай артыкула 53 пасля слоў «адасобленых падраздзяленняў прадпрыемства» дапоўніць словам «добраахвотнага», а таксама выключыць з яго словы «асацыяцыі і».

12. Частку другую артыкула 63 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Размер гэтай часткі прыбытку ўстанаўліваецца ўласнікам або ўпаўнаважаным ім органам, а парадак яе размеркавання вызначаецца сходам (канферэнцыяй) працоўнага калектыву».

13. Артыкул 71 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

«Для прадпрыемстваў, якія займаюць дамінуючае становішча на рынку, у адпаведнасці з антыманапольным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены часовыя абмежаванні свабоды рэалізацыі прадукцыі, работ і паслуг».

14. Артыкул 78 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

«Парадак адкрыцця рахункаў у банках вызначаецца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь».

15. У назве і тэксце артыкула 91 словы «органаў дзяржаўнай улады і кіравання», «Органы дзяржаўнай улады і кіравання» замяніць адпаведна словамі «органаў дзяржаўнага кіравання і мясцовых органаў дзяржаўнай улады», «Органы дзяржаўнага кіравання і мясцовыя органы дзяржаўнай улады».

16. Назву і тэкст артыкула 95 пасля слова «за» дапоўніць словамі «непрадстаўленне і».

17. У артыкуле 99:

дапоўніць тэкст артыкула новымі першай і другой часткамі наступнага зместу:

«У выпадку ўчынення прадпрыемствам дзеянняў, якія выходзяць за межы мэт і задач, вызначаных яго статутам, ці парушаюць закон, уласніку або ўпаўнаважанаму ім органу кіравання прадпрыемствам можа быць вынесена пісьмовае папярэджанне органам, які зарэгістраваў прадпрыемства, ці пракурорам.

У выпадках сістэматычнага ажыццяўлення дзейнасці:

якая супярэчыць мэтам дзейнасці прадпрыемства;

без належнага дазволу (ліцэнзіі);

якая забаронена заканадаўчымі актамі;

іншай дзейнасці з парушэннем заканадаўства —

орган, які зарэгістраваў прадпрыемства, ці пракурор маюць права прад'яўляць у суд іск аб яго ліквідацыі»;

дзеючыя часткі першую і другую лічыць адпаведна часткамі трэцяй і чацвёртай.

18. Артыкул 101 пасля слова «ўласніка» дапоўніць словамі «або ўпаўнаважанага ім органа».

19. У артыкуле 106:

у частцы другой словы «ці органа, упаўнаважанага ствараць такія прадпрыемствы» замяніць словамі «або ўпаўнаважанага ім органа»;

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Прадпрыемства ліквідуецца па рашэнню суда:

калі будуць прызнаны несапраўднымі акты аб стварэнні прадпрыемства;

у выпадку прызнання яго банкрутам;

у выпадках сістэматычнага ажыццяўлення дзейнасці:

якая супярэчыць мэтам дзейнасці прадпрыемства;

без належнага дазволу (ліцэнзіі);

якая забаронена заканадаўчымі актамі;

іншай дзейнасці з парушэннем заканадаўства»;

дапоўніць артыкул пасля часткі чацвёртай новай часткай наступнага зместу:

«Прадпрыемства можа быць ліквідавана на іншых падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь»;

частку пятую лічыць часткай шостай.

20. У артыкуле 110:

часткі першую і другую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Прэтэнзіі крэдытораў да ліквідуемага прадпрыемства задавальняюцца з маёмасці гэтага прадпрыемства. Разлікі з крэдыторамі праводзяцца ў наступным парадку:

ажыццяўляецца капіталізацыя пачасовых плацяжоў, якія падлягаюць выплаце з гэтага прадпрыемства ў сувязі з яго адказнасцю за прычыненне калецтва ці іншага пашкоджання здароўя або са смерцю асобы;

ажыццяўляюцца разлікі па аплаце працы з членамі працоўнага калектыву;

уносяцца плацяжы ў бюджэт і на мэты сацыяльнага страхавання і сацыяльнага забеспячэння;

кампенсуюцца затраты па рэкультывацыі зямель, якія знаходзіліся ў карыстанні ліквідуемага прадпрыемства;

ажыццяўляюцца разлікі з іншымі крэдыторамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Пры недастатковасці маёмасці ліквідуемага прадпрыемства яна размяркоўваецца паміж крэдыторамі адпаведнай чаргі прапарцыянальна сумам патрабаванняў, якія падлягаюць задавальненню»;

дапоўніць артыкул часткамі чацвёртай і пятай наступнага зместу:

«Маёмасць прадпрыемства, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдытораў, перадаецца ўласніку прадпрыемства, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Пры ліквідацыі прадпрыемства ўклад члена працоўнага калектыву выдаецца яму ў грашовай форме».

21. Артыкулы 111 і 112 выключыць.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

27 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2131—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

50 Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» з моманту яго прыняцця.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада ў адпаведнасць з гэтым Законам;

распрацаваць парадак рэгістрацыі змяненняў і дапаўненняў ва ўстаноўчыя дакументы прадпрыемстваў;

устанавіць парадак фарміравання статутнага фонду прадпрыемства.

3. Даручыць Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь з прыцягненнем зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў у месячны тэрмін распрацаваць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і зацвердзіць палажэнне аб парадку адкрыцця ў банках разліковых і іншых рахункаў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

27 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2132—XII.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

51 Аб унясенні дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях*

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Дапоўніць Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, прыняты Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 6 снежня 1984 года (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт. 505; 1985 г., № 32, арт. 449, № 35, арт. 505; 1986 г., № 17, арт. 227; 1987 г., № 22, арт. 282, № 26, арт. 337; 1988 г., № 24, арт. 377; 1989 г., № 10, арт. 94, № 11, арт. 99, № 12, арт. 114; 1990 г., № 6, арт. 80, № 11, арт. 138, № 13, арт. 186; Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 13(15), арт. 152, 156, № 23, арт. 309, № 25, арт. 366; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 15, арт. 255), артыкулам 167^6 наступнага зместу:

«Артыкул 167^6. **Пакіданне службовай асобай без афіцыйнага адказу дэпутацкага запыту**

Пакіданне службовай асобай без афіцыйнага адказу дэпутацкага запыту, а таксама несвоечасовы яго разгляд ці наўмыснае прадстаўленне няпоўнай або недакладнай інфармацыі па запыту,—

цягне накладанне штрафу ў размеры ад адной да трох мінімальных заработных плат».

2. Артыкул 202 Кодэкса пасля лічбаў «167^5» дапоўніць лічбамі «167^6».

3. Частку першую артыкула 237 пасля лічбаў «126» дапоўніць лічбамі «167^6».

4. Гэты Закон увесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

27 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2133—XII.

---

* *Апублікаваны ў газетах: «Звязда» — 24 лютага 1993 года, «Народная газета» — 13 сакавіка 1993 года.*

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

52 Аб унясенні змянення ў артыкул 14 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь»*

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. У частцы шостай артыкула 14 Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 лютага 1991 года «Аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 14(16), арт. 157) слова «трохдзённы» замяніць словам «дзесяцідзённы».

2. Гэты Закон увесці ў дзеянне з моманту прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

27 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2134—XII.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

53 Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь»**

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У артыкуле 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 1979 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (ЗЗ БССР, 1979 г., № 18, арт. 296; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 6, арт. 98, арт. 104) словы «Міністэрства транспарту» замяніць словамі «Міністэрства транспарту і камунікацый».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

5 лютага 1993 года, гор. Мінск.
№ 2173—XII.

---

* *Апублікаваны ў газетах: «Звязда» — 10 лютага 1993 года, «Народная газета» — 12 лютага 1993 года.*

** *Апублікаваны ў газетах: «Народная газета» — 18 лютага 1993 года, «Звязда» — 19 лютага 1993 года.*

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

54 Аб змяненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выключыць з парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання пытанне «Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пастаўках (работах і паслугах) для дзяржаўных патрэб».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

10 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2036—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

55 Аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Дапоўніць парадак дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання пытаннем «Аб прадстаўленні Пракуратуры Рэспублікі Беларусь у сувязі з парушэннямі выбарчага заканадаўства пры выбарах народнага дэпутата Бухавіцкага сельскага Савета народных дэпутатаў Кобрынскага раёна».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

16 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2048—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

56 Аб выбранні Шаладонава В. І. Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць **Шаладонава** Васіля Іванавіча Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2062—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

57 Аб праекце Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Даручыць Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **Шушкевічу С. С.** падпісаць ад Рэспублікі Беларусь рашэнне аб прыняцці Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
2. Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь сумесна з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць прапановы па магчымых агаворках і заявах для разгляду іх пры ратыфікацыі Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2066—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

58 Аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Дапоўніць парадак дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэс-

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

54 Аб змяненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выключыць з парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання пытанне «Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пастаўках (работах і паслугах) для дзяржаўных патрэб».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

10 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2036—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

55 Аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Дапоўніць парадак дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання пытаннем «Аб прадстаўленні Пракуратуры Рэспублікі Беларусь у сувязі з парушэннямі выбарчага заканадаўства пры выбарах народнага дэпутата Бухавіцкага сельскага Савета народных дэпутатаў Кобрынскага раёна».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

16 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2048—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

56 Аб выбранні Шаладонава В. І. Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць **Шаладонава** Васіля Іванавіча Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2062—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

57 Аб праекце Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Даручыць Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **Шушкевічу С. С.** падпісаць ад Рэспублікі Беларусь рашэнне аб прыняцці Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
2. Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь сумесна з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць прапановы па магчымых агаворках і заявах для разгляду іх пры ратыфікацыі Статута Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

23 снежня 1992 года, гор. Мінск.
№ 2066—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

58 Аб дапаўненні парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Дапоўніць парадак дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэс-

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

63 Аб змяненні ў складзе Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па заканадаўству

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць у склад Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па заканадаўству **Шыпко** Аляксандра Яўгеньевіча, народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь ад Глыбоцкай выбарчай акругі № 147 Віцебскай вобласці, зацвердзіўшы яго сакратаром гэтай Камісіі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

20 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2114—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

64 Аб прызнанні паўнамоцтваў народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь, выбранага 17 студзеня 1993 года

Разгледзеўшы прадстаўленне Камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць паўнамоцтвы выбранага 17 студзеня 1993 года ад Рэчыцкай выбарчай акругі № 140 народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь **Піцухі** Валерыя Іванавіча.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

20 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2115—XII.

ПАСТАНОВА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

65 Аб Эканамічнай праграме Урада Рэспублікі Беларусь на 1993 год і асноўных напрамках развіцця народнай гаспадаркі на перспектыву

Кіруючыся Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, што вызначаюць прававую аснову функцыяніравання народнай гаспадаркі ў 1993 годзе, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Адобрыць палажэнні Эканамічнай праграмы Урада Рэспублікі Беларусь на 1993 год і асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі на перспектыву.

Прыняць да ведама:

Важнейшыя параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1993 годзе:

	1993 г. у працэнтах да 1992 г. у супастаўных цэнах 1992 г.
валавы нацыянальны прадукт	96,8
выраблены нацыянальны даход	96,2
прадукцыйнасць грамадскай працы	97,5
прадукцыя прамысловасці — усяго	94,5
у тым ліку:	
сродкі вытворчасці (група «А»)	91,5
сродкі спажывання (група «Б»)	101,3
валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	104,5
вытворчасць тавараў народнага спажывання — усяго	103,2
у тым ліку:	
харчовыя тавары	100,1
нехарчовыя тавары	102,8
рознічны тавараабарот, уключаючы недзяржаўны сектар гандлю	87,5
платныя паслугі насельніцтву	100
знешнегандлёвы абарот	131,1
капітальныя ўкладанні за кошт усіх крыніц фінансавання	97,8
увод у дзеянне аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы за кошт усіх крыніц фінансавання	*1993 г.*
жылыя дамы, тыс. кв. метраў агульнай плошчы	5532
дашкольныя ўстановы, тыс. месцаў	13,98
агульнаадукацыйныя школы, тыс. месцаў	41
клубы і дамы культуры, тыс. месцаў	6
бальніцы, тыс. ложкаў	2,32

амбулаторна-паліклінічныя ўстановы, тыс. наведванняў у змену 8,8

дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў, тыс. месцаў 0,81

	Рост 1993 г. супраць 1992 г. (у цэнах адпаведных гадоў)
фінансавыя рэсурсы рэспублікі	3,8 раза
крэдытныя рэсурсы рэспублікі	1,9 раза
сярэднемесячная заработная плата па народнай гаспадарцы	2,8 раза
мінімальная пенсія	4,1 раза

Важнейшыя параметры развіцця народнай гаспадаркі на перыяд да 1995 года:

	1995 г. у працэнтах да 1993 г. у супастаўных цэнах	*сярэднегадавы тэмп прыросту*
валавы нацыянальны прадукт	104,9	2,4
выраблены нацыянальны даход	104,4	2,2
прадукцыя прамысловасці	100,8	0,4
валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі	109,9	4,8
вытворчасць тавараў народнага спажывання	108	3,9

Асноўнымі задачамі на доўгатэрміновую перспектыву лічыць структурную перабудову эканомікі, актывізацыю інвестыцыйнай дзейнасці, стабілізацыю, эканамічны рост і павышэнне ўзроўню жыцця народа, інтэграцыю ў сусветную гаспадарку.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіць на 1993 год пастаўкі прадукцыі (работ і паслуг) для дзяржаўных патрэб, ліміты фінансуемых з рэспубліканскага бюджэту капітальных укладанняў і цэнтралізавана размяркоўваемых матэрыяльных рэсурсаў і ў месячны тэрмін давесці іх да выканаўчых камітэтаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў, міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый.

3. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь разгледзець заўвагі і прапановы пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, выказаныя пры абмеркаванні праекта Эканамічнай праграмы Урада Рэспублікі Беларусь на 1993 год і асноўных напрамкаў развіцця народнай гаспадаркі на перспектыву, і прыняць па іх неабходныя меры.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

25 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2117—XII.

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

66 Аб прадастаўленні зямельных участкаў Беларускаму навукова-даследчаму інстытуту кардыялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь для будаўніцтва рэспубліканскага кардыялагічнага цэнтра

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**


1. Адабраць зямельныя ўчасткі агульнай плошчай 11,3 га, у тым ліку 9,4 га (8,1 га ворнай зямлі, 0,4 га паш і 0,9 га іншых угоддзяў) з зямель калгаса імя Калініна Мінскага раёна і 1,9 га (прысядзібныя землі) з зямель Шчамысліцкага сельскага Савета народных дэпутатаў і прадаставіць гэтыя ўчасткі Беларускаму навукова-даследчаму інстытуту кардыялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь для будаўніцтва рэспубліканскага кардыялагічнага цэнтра.

Захаваць за ранейшымі землеўладальнікамі права валодання зямельнымі ўчасткамі, якія адбіраюцца, да фактычнага заняцця іх для ўказаных патрэб.

2. Урон, прычынены землеўладальнікам адабраннем зямельных участкаў, а таксама страты сельскагаспадарчай вытворчасці, звязаныя з адабраннем сельскагаспадарчых угоддзяў для нясельскагаспадарчых патрэб, кампенсуюцца ва ўстаноўленым парадку дырэкцыяй будуемага прадпрыемства Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

6 студзеня 1993 года, гор. Мінск.
№ 2097—XII.



ВЕДОМОСТИ

ВЕРХОВНОГО СОВЕТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

15 марта 1993 г. № 8(82) Издаются с 1990 г.

СОДЕРЖАНИЕ

Законы и постановления, принятые на десятой сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва

изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О предприятиях в Республике Беларусь».

51. Закон Республики Беларусь о внесении дополнений в Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях.
52. Закон Республики Беларусь о внесении изменения в статью 14 Закона Республики Беларусь «О статусе народного депутата Республики Беларусь».
53. Закон Республики Беларусь о внесении изменений в Закон Республики Беларусь «О Совете Министров Республики Беларусь».
54. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь об изменении повестки дня десятой сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва.
55. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о дополнении повестки дня десятой сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва.
56. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь об избрании Шолодонова В. И. Генеральным прокурором Республики Беларусь.
57. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о проекте Устава Содружества Независимых Государств.
58. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о дополнении повестки дня десятой сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва.
59. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о председателе Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по международным делам и внешнеэкономическим связям.
60. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о заместителе председателя Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по проблемам чернобыльской катастрофы.
61. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о секретаре Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по государственному строительству.
62. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь об изменениях в составе Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по вопросам национальной безопасности, обороны и борьбы с преступностью.
63. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь об изменении в составе Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по законодательству.
64. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь о признании полномочий народного депутата Республики Беларусь, избранного 17 января 1993 года.
65. Постановление Верховного Совета Республики Беларусь об Экономической программе Правительства Республики Беларусь на 1993 год и основных направлениях развития народного хозяйства на перспективу.

* * *

